(ознакомительный фрагмент)

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**На правах рукапісу**
**УДК 94 (437) (= 161.3) "1921/1938"**

**Буча Андрэй Іванавіч**

# Беларуская дыяспара ў Чэхаславакіі (1921–1938 гг.)

Аўтарэферат
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.03 – усеагульная гісторыя

**Мінск, 2012**

Праца выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік: Салькоў Анатоль Пятровіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, загадчык кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян

Афіцыйныя апаненты: Шадурскі Віктар Генадзьевіч, доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Вашкевіч Іна Валер'еўна, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі

Апаніруючая арганізацыя: Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка»

Абарона адбудзецца 25 кастрычніка 2012 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе:
220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, ауд. 407.
Тэл. вучонага сакратара (8-017) 227-45-11.
E-mail: menkovski@bsu.by

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «24» верасня 2012 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук, прафесар В.І. Менькоўскі

# УВОДЗІНЫ

Для глабалізаванага свету характэрна імклівае развіццё міграцыйных працэсаў. Як следства, у жыцці сучасных грамадстваў значна павялічваецца сацыяльна-палітычная, эканамічная і культурная роля этнічных груп і этнанацыянальных дыяспар. Гэта абумоўлівае рост акадэмічнага інтарэсу да праблем, звязаных з функцыянаваннем дыяспаральных супольнасцей.

Дыскурс дыяспары асабліва актуальны для Рэспублікі Беларусь, за межамі якой у пачатку 1990-х гг. пражывала каля 3–3,5 млн. беларусаў[1]. Падчас самастойнага існавання беларускай дзяржавы выявілася тэндэнцыя да скарачэння беларускай дыяспары, сярод якой атрымалі распаўсюджванне асіміляцыйныя працэсы. Паводле нашых падлікаў, у Расіі, Казахстане, Польшчы, Латвіі, Літве, Эстоніі і на Украіне на сённяшні дзень пражывае каля 1,1 млн. беларусаў, што прыкладна на 49 % менш у параўнані з дадзенымі 20-гадовай даўнасці.

У адпаведнасці з Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, аслабленне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларускай дыяспары з'яўляецца знешняй крыніцай пагрозы нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь у сацыяльнай сферы[2]. У сувязі з гэтым, вывучэнне дзейнасці беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі (1921–1938 гг.) дапаможа наблізіцца да глыбейшага разумення праблемы захавання нацыянальнай ідэнтычнасці, якая надзвычай актуальная для сучаснага беларускага замежжа.

Беларуская дыяспара валодае велізарным эканамічным, палітычным, культурным і навуковым патэнцыялам, эфектыўнае выкарыстанне якога на карысць метраполіі можна лічыць адной з умоў далейшага паступальнага развіцця беларускай дзяржавы. Несумненна, што пры рэалізацыі доўгатэрміновай стратэгіі садзейнічання развіццю беларускай дыяспары дзяржаўным органам Рэспублікі Беларусь мэтазгодна ўлічваць гістарычны вопыт узаемаадносін з беларускай дыяспарай, а таксама традыцыі пражывання суайчыннікаў у замежжы. Акрамя таго гісторыя беларуска-чэхаславацкіх кантактаў у 1920-я – 1930-я гг. можа стаць дадатковым фактарам аптымізацыі двухбаковых беларуска-чэшскіх адносін на сучасным этапе.

На працягу 1921–1938 гг., ва ўмовах правядзення чэхаславацкім урадам «Рускай акцыі» (праграма па падтрымцы эмігрантаў з былой Расійскай імперыі), Чэхаславакія з'ўлялася інтэлектуальным, акадэмічным, навукова-даследчым цэнтрам беларускага замежжа. Менавіта ў гэтай краіне найбольш яскрава выявілася тэндэнцыя да згуртавання прадстаўнікоў дыяспары вакол ідэі беларускай дзяржаўнасці. Арганізацыі, створаныя дыяспарай, спрыялі захаванню нацыянальнай ідэнтычнасці, садзейнічалі сацыяльна-эканамічнай і прававой адаптацыі эмігрантаў.

---

[1] Сяргеева, Г. Дыяспара / Г. Сяргеева // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1993–2003. – Т. 3. – 1996. – С. 328.
[2] Концепция национальной безопасности Республики Беларусь. – Минск: Белорусский Дом печати, 2011. – С. 23.

Дысертацыя з'яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі даследаваннем, прысвечаным дадзенай праблеме. Яна запаўняе істотны прабел у айчыннай і замежнай гістарычнай навуцы, звязаны з гісторыяй беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ў міжваенны перыяд.

Ніжняя дата дысертацыі звязана з пачаткам правядзення «Рускай акцыі», якая дала імпульс фарміраванню структур беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі. У перыяд Другой Чэха-Славацкай рэспублікі (кастрычнік 1938 – сакавік 1939 г.) і нямецкай акупацыі чэшскіх зямель усходнеславянскія дыяспары працягвалі функцыянаваць, але восенню 1938 г. дзяржаўная эміграцыйная палітыка значна трансфармавалася, адбыўся поўны адыход ад канцэптуальных асноў «Рускай акцыі».

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

### *Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі*

Праблематыка дысертацыі звязана з навуковай дзейнасцю кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Тэма распрацоўвалася ў кантэксце праблемнага поля планавых навукова-даследчых работ кафедры: «Национально-территориальные и социокультурные проблемы в истории славянских стран XIX–XX вв.» на 2003–2005 гг. (№ 2003968), «Национальная идея и национальное государство как составляющая социального прогресса в истории славянских народов (конец XVIII – начало XXI в.)» (№ 20061328), уключаных у ДКПНД «История и культура», а таксама «Международные отношения в Юго-Восточной Европе и на Балканах в XX – начале XXI в.» на 2011–2015 гг. (№ 20112605), уключанай у ДКПНД «История, культура, общество, государство».

### *Мэта і задачы даследавання*

**Мэта** працы заключаецца ў тым, каб высветліць прычыны, умовы, вынікі фарміравання і дзейнасці беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ў 1921–1938 гг. У адпаведнасці са сфармуляванай мэтай былі пастаўлены наступныя **задачы**:

– прааналізаваць чэхаславацкую ўрадавую праграму «Руская акцыя», яе характар, змест, накірункі трансфармацыі і прычыны ліквідацыі;

– прасачыць за працэсам фарміравання беларускай дыяспары і вызначыць ролю яе інстытутаў у адаптацыі беларускіх эмігрантаў;

– раскрыць значэнне ВНУ ЧСР для беларускай моладзі і ахарактарызаваць беларускую студэнцкую супольнасць у Чэхаславакіі;

– ахарактарызаваць дзейнасць беларускіх навукова-даследчых устаноў у Чэхаславакіі і раскрыць змест дыяспарнай актыўнасці ў накірунку папулярызацыі нацыянальнай культуры сярод замежнікаў;

– ацаніць супраціўляльнасць беларускай дыяспары асіміляцыйным тэндэнцыям і акрэсліць яе стратэгію па захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці;

– прасачыць за эвалюцыяй узаемаадносін паміж ідэалагічнымі групоўкамі дыяспары і выявіць ступень уплыву беларускага нацыянальнага руху і савецкай ідэалогіі на грамадска-палітычнае жыццё беларускай супольнасці ў ЧСР.

**Аб'ектам** даследавання выступае эміграцыйная палітыка Чэхаславакіі ў 1921–1938 гг., накіраваная на падтрымку ўраджэнцаў былой Расійскай імперыі. **Прадмет** даследавання ахоплівае грамадска-палітычную, культурна-асветніцкую і навукова-адукацыйную дзейнасць беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ва ўмовах рэалізацыі ўрадавай праграмы «Руская акцыя» у 1921–1938 гг.

***Палажэнні, якія выносяцца на абарону***

1. Фарміраванне беларускай дыяспары ў Чэхаславакі стала магчымым дзякуючы правядзенню чэхаславацкім урадам (з лета 1921 г.) праграмы па падтрымцы эміграцыі з былой Расійскай імперыі («Руская акцыя»). Асноўнай складаючай гэтай праграмы была падрыхтоўка ў ВНУ Чэхаславакіі эмігранцкай моладзі, якая ў будучым, па меркаванні прэзідэнта ЧСР Т.Г. Масарыка, павінна была адыграць ключавую ролю ў адраджэнні дэмакратычнай, федэратыўнай і прыхільнай да Чэхаславакіі Расіі. Беларускія арганізацыі (Таварыства беларускай школы ў Вільні, урад Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) і беларускі аддзел Міністэрства адукацыі Латвіі пры агульнай каардынацыі Беларускай грамады і прадстаўніцтва БНР у ЧСР) скарысталі «Рускую акцыю» для вырашэння іншай задачы, а менавіта для падрыхтоўкі кадраў беларускай інтэлігенцыі, неабходных для аказання супраціўлення асіміляцыйнай палітыцы польскіх улад у Заходняй Беларусі і арганізацыі беларускай меншасці ў Латвіі.

2. У 1920-я – 1930-я гг. у ВНУ ЧСР навучалася прыкладна 700 этнічных беларусаў (10 % ад агульнай колькасці стыпендыятаў чэхаславацкага ўрада). Каля 200 беларусаў карысталіся стыпендыямі, якія былі прызначаны беларускім нацыянальным арганізацыям у Заходняй Беларусі, Літве і Латвіі. ВНУ ЧСР сталі адной з асноўных пляцовак для атрымання вышэйшай адукацыі выпускнікамі заходнебеларускіх гімназій. Трэба ўлічваць, што маштабы выдзялення стыпендый беларусам знаходзіліся ў прамой залежнасці ад стану чэхаславацка-польскіх адносін. Неўрэгуляванасць «цешынскага пытання» ў першай палове 1920-х гг. з'яўлялася спрыяльным фактарам для беларускіх студэнтаў. Нармалізацыя чэхаславацка-польскіх адносін у красавіку 1925 г. прывяла да значнага скарачэння колькасці стыпендый для беларускай моладзі.

3. У 1927 г. канцэпцыя «Рускай акцыі» была перагледжана ў бок пераўтварэння Прагі ў еўрапейскі цэнтр славістычных даследаванняў (у такім выглядзе праграма праіснавала да 1938 г.). Адной з частак новага фармату «Рускай акцыі» стала заснаванне першых ва ўмовах эміграцыі беларускіх навукова-даследчых устаноў – Беларускага навуковага кабінета і Беларускага загранічнага архіва. Дзейнасць азначаных устаноў заклала традыцыі эміграцыйнага беларусазнаўства і архівістыкі. Спрыяльныя ўмовы, створаныя краінай-

рэцыпіентам, садзейнічалі рэалізацыі інтэлектуальнага патэнцыялу беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі.

4. Дзякуючы дзейнасці культурна-асветніцкіх аб'яднанняў, адкрыццю бібліятэк, выданню беларускамоўнай прадукцыі (выходзіла 7 часопісаў), падтрыманню кантактаў з беларускімі арганізацыямі ў Заходняй Беларусі, Літве, Латвіі і БССР, беларуская дыяспара ў ЧСР справілася з задачай захавання нацыянальнай ідэнтычнасці. Больш таго, у першай палове 1920-х гг. рабіліся спробы беларусізацыі этнічных беларусаў, ангажаваных у дзейнасць расійскай эміграцкай групы. Аднак своечасовыя контрмеры (стварэнне Таварыства студэнтаў маларосаў і беларусаў «Адзінства рускай культуры», выкарыстанне фінансавых рычагоў ціску), прынятыя кіраўніцтвам расійскай дыяспары, не дазволілі распаўсюдзіцца дадзенаму працэсу.

5. У міжваеннай Чэхаславакіі дзейнічала 14 беларускіх і 5 беларуска-украінскіх аб'яднанняў рознай ідэйна-палітычнай накіраванасці. У першай палове 1920-х гг. унутрыпалітычнае жыццё беларускай супольнасці вызначала барацьба паміж левай і правай групамі дыяспары. Асноўныя спрэчкі паміж апанентамі тычыліся выбару шляхоў дасягнення суверэнітэту Беларусі і прынцыпаў пабудовы БНР. У сярэдзіне 1920-х гг. абазначыўся ідэалагічны падзел дыяспары па прычыне рознагалоссяў у выбары формы беларускай дзяржаўнасці (БССР ці БНР). Папулярызацыі прасавецкага руху сярод чэхаславацкіх беларусаў спрыялі поспехі нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР, дзейнасць Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б) і прадстаўніцтва СССР у ЧСР з беларускай дыяспарай, крызіс палітычных структур БНР. Пасля Берлінскай канферэнцыі 1925 г., на якой была спынена дзейнасць урада БНР, пад пагрозай страты ўплыву ў асяроддзі беспартыйных беларусаў нацыянальна-дэмакратычная група дыяспары кансалідавалася вакол Беларускай рады ў Празе.

6. У другой палове 1920-х гг. нацыянальна-дэмакратычны і прасавецкі лагеры дыяспары мелі прыкладна аднолькавую колькасць прыхільнікаў. Нарастанне аўтарытарных тэндэнцый у кіраўніцтве і палітычныя рэпрэсіі супраць інтэлігенцыі ў БССР у канцы 1920-х гг. прывялі да кампраметацыі зменавехаўскага руху сярод беларускай дыяспары, а прасавецкія студэнцкія аб'яднанні, у сувязі з рээміграцыяй сяброў, спынілі сваю дзейнасць. У першай палове 1930-х гг. сярод нацыянальна-дэмакратычных арганізацый найбольшую актыўнасць выявіла Аб'яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый (АБСА), якое засяродзілася на ўдзеле ў міжнародным студэнцкім руху. У другой палове 1930-х гг. у сувязі са змяншэннем колькасці беларусаў у ЧСР і з-за адсутнасці падтрымкі з чэхаславацкага боку (у межах «Рускай акцыі» працягвалася субсідзіраванне толькі некаторых расійскіх і ўкраінскіх устаноў), дзейнасць беларускіх арганізацый у Чэхаславакіі фактычна спынілася.

*Асабісты ўклад суіскальніка*

Дысертацыя з'яўляецца вынікам самастойнай даследчай працы суіскальніка. Даследаванне пабудавана на матэрыялах з архіваў Чэхіі, Беларусі, Расіі, большая частка якіх упершыню ўводзіцца ў навуковы абарот, а таксама на апублікаваных крыніцах. Вынікі дысертацыі, якія выносяцца на абарону, абгрунтаваны аўтарам, дзякуючы правядзенню тэарэтычнага аналізу сучаснага стану праблемы даследавання і крытычнага падыходу да вывучэння крыніц.

*Апрабацыя вынікаў дысертацыі*

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі прадстаўлены аўтарам на шэрагу навуковых канферэнцыях: Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці (да 90-годдзя з дня ўтварэння БССР)» (Мінск, Інстытут гісторыі АН РБ, 18 снежня 2008 г.); II міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Европа: актуальные проблемы этнокультуры» (Мінск, БДПУ, 25 красавіка 2008 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Романовские чтения – 5» (Магілёў, МДУ, 27–28 лістапада 2008 г.); Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Геополитические трансформации в Восточной Европе между двумя мировыми войнами (к 90-летию Рижского мирного договора)» (Брэст, БрДУ, 17–18 сакавіка 2011 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Славія. Славянскія моўныя і культурныя ідэнтычнасці» (Браціслава, універсітэт Я.А. Коменскага, 14–15 красавіка 2011 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Рыжскі дагавор 1921 г. у кантэксце ваеннай і палітычнай гісторыі Цэнтральна-Усходняй Еўропы» (Беласток, Беларускае гістарычнае таварыства ў Беластоку, 28–29 красавіка 2011 г.); Рэспубліканскай канферэнцыі маладых навукоўцаў «Актуальные проблемы отечественной и мировой истории» (Мінск, БДУ, 27–28 верасня 2011 г.); II навукова-практычнай канферэнцыі маладых навукоўцаў факультэта міжнародных адносін БДУ (Мінск, БДУ, 2 лютага 2012 г.).

Дысертацыя была рэкамендавана да абароны на пасяджэнні кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 15 ад 15 чэрвеня 2012 г.).

*Апублікаванасць вынікаў дысертацыі*

Асноўныя вынікі даследавання адлюстраваны ў 12 навуковых працах агульным аб'ёмам 4,7 а. а. Сярод іх чатыры артыкулы ў навуковых часопісах, якія адпавядаюць патрабаванням ВАК, аб'ёмам 2,7 а. а., а таксама матэрыялы сямі навуковых канферэнцый і адна рэцэнзія.

*Структура і аб'ём дысертацыі*

Дысертацыя складаецца з пераліку ўмоўных абазначэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі працы, 4 глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, дадаткаў (А–Д). Агульны аб'ём дысертацыі складае 159 старонак, з якіх 115 старонак асноўнага тэксту. Бібліяграфічны спіс дысертацыі змяшчае 453 пазіцыі, уключаючы 12 публікацый аўтара.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы ў навуковых часопісах

1. Буча, А.И. Начальный этап «Русской акции» Чехословацкого правительства и организационное оформление белорусской диаспоры в Чехословакии (1921–1923 гг.) / А.И. Буча // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 5 / редкол.: А.П. Сальков, О.А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. – Минск: БГУ, 2010. – С. 80–86.

2. Буча, А.І. Дакументы аб грамадска-палітычнай дзейнасці беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь / А.І. Буча // Беларускі археаграфічны штогоднік / Рэд. кал.: Э.М. Савіцкі (гал. рэд.) [і інш]. – Мінск: БелНДІДАС, 2011. – Вып. 12. – С. 107–116.

3. Буча, А.І. Беларускае грамадска-палітычнае жыццё ў Чэхаславакіі ад часу прыезду ўрада БНР у Прагу да правядзення Берлінскай канферэнцыі / А.І. Буча // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 6 / редкол.: А.П. Сальков, О.А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. – Минск: БГУ, 2011. – С. 152–160.

4. Буча, А.І. Невядомы сюжэт з жыцця беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі: Беларускі настаўніцкі інстытут у Празе (1922–1923 гг.) / А.І. Буча // Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2012. – № 1. – С. 11–14.

### Матэрыялы канферэнцый

5. Буча, А.І. Да пытання аб стварэнні Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый Заходняй Беларусі і эміграцыі / А.І. Буча // Европа: актуальные проблемы этнокультуры: материалы II Междун. науч.-теорет. конф., г. Минск, 25 апреля 2008 г. / БГПУ им. Максима Танка; редкол. В.В. Тугай (отв. ред.), А.П. Житко, Г.А. Космач. – Минск: БГПУ, 2008. – С. 320–322.

6. Буча, А.І. Дзейнасць прасавецкіх арганізацый беларускай студэнцкай моладзі ў Чэхаславакіі ў 20-я гг. XX ст. / А.І. Буча // Человек. Цивилизация. Культура: XIII межвузовская науч.-теорет. конф.: Тезисы докл.: г. Минск, 18 апреля 2008 г.: в 2 ч. / Ред. кол.: Алпеев А. Н. (гл. ред.) [и др.]. – Минск: МГЭУ, 2008. – Ч. 2. – С. 21–24.

7. Буча, А.І. Беларускія студэнцкія арганізацыі ў Чэхаславакіі ў 20-я – першай палове 30-х гг. XX ст. (гістарыяграфія праблемы) / А.І. Буча // Романовские чтения – 5: сб. трудов Междун. науч. конф., г. Могилев, 27–28 ноября 2008 года. / Редкол.: Н.М. Пурышева [и др.]. – Могилёв: МГУ им. А.А. Кулешова, 2009. – С. 54–55.

8. Буча, А.І. Дзейнасць беларускіх студэнцкіх арганізацый у Чэхаславакіі ў першай палове 1930-х гг. / А.І. Буча // Сборник материалов Международного Форума студенческой и учащейся молодёжи «Первый шаг в науку – 2009». Том 1.

/ Центр студенческих научных инициатив при Совете молодых учёных Национальной академии наук Беларуси. – Минск: Право и экономика, 2009. – С. 435–438.

9. Буча, А.І. Папулярызацыя ідэі беларускай дзяржаўнасці пад эгідай БССР у асяроддзі беларускіх студэнтаў у Чэхаславакіі ў 20-я гг. XX ст. / А.І. Буча // Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці (да 90-годдзя з дня ўтварэння БССР): матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 18 снеж. 2008 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Нац. акад. навук Беларусі; рэдкал.: А.А. Каваленя (старш.) [і інш.]. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2009. – С. 255–258.

10. Буча, А.І. Міжваенная Чэхаславакія як адзін з аўтарытэтных і буйных асяродкаў па падрыхтоўцы кадраў беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі / А.І. Буча // Геополитические трансформации в Восточной Европе между двумя мировыми войнами (к 90-летию Рижского мирного договора): сб. материалов междун. науч.-практ. конф.; Брест, 17–18 марта 2011 г. / БрГУ; редкол.: М.Э. Чесновский (гл. ред.) [и др.]. – Брест: БрГУ, 2011. – С. 61–67.

11. Буча, А.І. Да гісторыі дзейнасці дыпламатычнага прадстаўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі ў Чэхаславакіі / А.І. Буча // Международные отношения: история, теория, практика: материалы II науч.-практ. конф. молодых учёных факультета. международных отношений БГУ, Минск, 2 апр. 2012 г. / редкол.: В.Г. Шадурский [и др.]. – Минск: Изд. центр БГУ, 2012. – С. 18–21.

**Рэцэнзіі**

12. Буча, А.И. [Рецензия] / А.И. Буча // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 5 / редкол.: А.П. Сальков, О.А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. – Минск: БГУ, 2010. – Вып. 5. – С. 363–364. – Рец. на книгу: Život plný střetů: dilo a odkaz historika Jana Slavíka (1885–1978) / sestavili Lukaš Babka a Petr Roubal. – 1. vyd. – Červený Kostelec: Pavel Mervart; Praha: Národní knihovna ČR – Slovanská knihovna, 2009. – 454 s.

## РЭЗЮМЭ

**Буча Андрэй Іванавіч**

**Беларуская дыяспара ў Чэхаславакіі (1921–1938 гг.)**

**Ключавыя словы:** «Руская акцыя», беларуская дыяспара, эміграцыйная палітыка, савецка-чэхаславацкія адносіны, беларускі нацыянальны рух, зменавехаўства, нацыянальная ідэнтычнасць, Беларуская рада ў Празе, Аб'яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый, Беларускі навуковы кабінет, Беларускі заграцічны архіў

Мэта працы заключаецца ў тым, каб высветліць прычыны, умовы, вынікі фарміравання і дзейнасці беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ў 1921–1938 гг.

Метадалагічную аснову даследавання склалі прынцыпы гістарызму і навуковай аб'ектыўнасці. Праца выканана з выкарыстаннем як агульнанавуковых (лагічнага, класіфікацыі, аналізу і сінтэзу), так і спецыяльных гістарычных (гісторыка-генетычнага, гісторыка-параўнальнага, гісторыка-сістэмнага) метадаў.

Вынікам працы стала вызначэнне ідэалагічнага зместу чэхаславацкай урадавай праграмы «Руская акцыя» і рэканструкцыя этапаў яе правядзення, устанаўленне прычын эміграцыі беларусаў у Чэхаславакію, выяўленне спецыфікі складвання структур беларускай дыяспары ў гэтай славянскай краіне, фармуліроўка ступені значнасці чэхаславацкіх ВНУ для атрымання вышэйшай адукацыі заходнебеларускай моладзю ва ўмовах фактычнай закрытасці для яе вышэйшых школ II Рэчы Паспалітай, раскрыццё характару і асаблівасцей грамадска-палітычнай, культурна-асветніцкай і навукова-даследчай дзейнасці беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ў 1921–1938 гг.

Навуковая навізна працы для айчыннай і замежнай гістарыяграфіі вызначаецца тым, што ўпершыню на аснове выкарыстання шэрагу матэрыялаў з архіваў Чэхіі, Беларусі і Расіі праведзена комплекснае даследаванне арганізацыйнай структуры і накірункаў дзейнасці беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ў 1921–1938 гг. у цеснай сувязі з аналізам эміграцыйнай палітыкі краіны-рэцыпіента.

Матэрыялы і высновы дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ў ВНУ, пры напісанні вучэбных дапаможнікаў, навуковых манаграфій і артыкулаў. Атрыманыя вынікі дазваляюць зрабіць рэкамендацыі установам гуманітарнага і культурнага супрацоўніцтва, а таксама навукова-даследчым цэнтрам, якія займаюцца багемістыкай і вывучэннем беларускага замежжа.

# РЕЗЮМЕ

## Буча Андрей Иванович

## Белорусская диаспора в Чехословакии (1921–1938 гг.)

**Ключевые слова:** «Русская акция», белорусская диаспора, эмиграционная политика, советско-чехословацкие отношения, белорусское национальное движение, сменовеховство, национальная идентичность, Белорусская рада в Праге, Объединение белорусских студенческих организаций, Белорусский научный кабинет, Белорусский заграничный архив

Цель работы заключается в том, чтобы выяснить причины, условия, результаты формирования и деятельности белорусской диаспоры в Чехословакии в 1921–1938 гг.

Методологическую основу исследования составили принципы историзма и научной объективности. Работа выполнена с использованием как общенаучных (логического, классификации, анализа и синтеза), так и специальных исторических (историко-генетического, историко-сравнительного, историко-системного) методов исследования.

Результатом работы стало определение иделогического содержания чехословацкой правительственной программы «Русская акция» и реконструкция этапов её проведения, установление причин эмиграции белорусов в Чехословакию, выявление специфики складывания структур белорусской диаспоры в этой славянской стране, формулировка степени значимости чехословацких вузов для получения высшего образования западнобелорусской молодёжью в условиях фактической закрытости для неё высших школ II Речи Посполитой, раскрытие характера и особенностей общественно-политической, культурно-просветительской и научно-исследовательской деятельности белоруской диаспоры в Чехословакии в 1921–1938 гг.

Научная новизна работы для отечественной и зарубежной историографии определяется тем, что впервые на основе использования широкого круга материалов из архивов Чехии, Беларуси и России проведено комплексное исследование организационной структуры и направлений деятельности белорусской диаспоры в Чехословакии в 1921–1938 гг. в тесной связи с изучением эмиграционной политики страны-реципиента.

Материалы и выводы диссертации могут быть использованы в учебно-воспитательном процессе в вузах, для написания учебных пособий, научных монографий и статей. Полученные результаты позволяют дать рекомендации учреждениям гуманитарного и культурного сотрудничества, а также научно-исследовательским центрам, занимающимся богемистикой и изучением белорусского зарубежья.

## SUMMARY

**Andrei Bucha**

### The Belarusian diaspora in Czechoslovakia (1921–1938)

**Key words:** «Russian action», Belarusian diaspora, emigration policy, Soviet-Czechoslovak relations, the Belarusian national movement, Smenovekhovtso, national identity, the Belarusian Council in Prague, the Belarusian Association of Student Organizations, the Belarusian Scientific office, the Belarusian foreign archives

The purpose of this work is to find out the reasons, conditions and results of the formation and activities of the Belarusian community in Czechoslovakia in 1921–1938.

A scientifically-methodological basis of research is made up with the principles of historicism and objectivity. The study was conducted with the help of both general scientific (logical, classification, analysis and synthesis) and special historical methods (historical-genetic, comparative-historical, historical-systematic).

As a result the ideology of Czechoslovak government program «Russian action» was defined and its stages were reconstructed, the causes of Belarusian emigration to Czechoslovakia were determined, the peculiarities of the Belarusian community patterns in this Slavic country were revealed, the work also states the degree of importance of the Czechoslovak universities for acquiring higher education by western Belarusian youth in conditions of an actual closure of higher schools of the Second Polish Republic for them, the nature and features of the socio-political, cultural, educational and research activities of Belarusian diaspora in Czechoslovakia in 1921–1938 is disclosed.

The scientific novelty of the work for the domestic and foreign historiography is in the fact that for the first time on a wide range of sources from the archives of the Czech Republic, the Republic of Belarus and the Russian Federation there was conducted a comprehensive study of the organization structure and areas of activity of the Belarusian diaspora in Czechoslovakia in 1921 – 1938 in closed connections with stydying of the emigration policy of the recipient country.

The materials and conclusions of the thesis can be used in the educational process in high schools, for writing textbooks, monographs and articles. The obtained results allow us to advise agencies of humanitarian and cultural cooperation as well as scientific centers conducted researches in area of Czech history and the history of Belarusian diaspora.